

РАЗДЗЕЛ IV

# ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ. КАНФЕСІЙНАЕ СТАНОВІШЧА Ў БЕЛАРУСІ

**Канкрэтызаваць значэнне паняццяў:**
беларуская нацыянальная ідэя, заходнерусізм, нацыя, нацыянальнае пытанне, нацыянальная самасвядомасць, беларусізацыя, канфесія, атэізм, свабода веравызнання.

**Характарызаваць:**
асноўныя этапы і асаблівасці фарміравання беларускай нацыі;
асаблівасці канфесійнага становішча на беларускіх землях на працягу XIX – пачатку XXI ст.

**Ацэньваць:**
вынікі нацыянальнай палітыкі ў БССР і Рэспубліцы Беларусь;
вынікі канфесійнай палітыкі ў беларускіх губернях у складзе Расійскай імперыі, БССР і Рэспубліцы Беларусь.

**Выкарыстоўваць веды:**
для ажыццяўлення пошуку і аналізу сацыяльна значнай інфармацыі аб фарміраванні беларускай нацыі, канфесійным (рэлігійным) жыцці насельніцтва Беларусі, нацыянальнай і канфесійнай палітыцы ў Рэспубліцы Беларусь, прадстаўленай у сродках масавай інфармацыі;
тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе іграных і дакументальных фільмаў, наведванні гістарычных славутасцей, музеяў і г. д.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Асноўныя падзеі нацыянальнага і канфесійнага развіцця Беларусі ў XIX – пачатку XXI ст.**

| Дата | Падзея |
|---|---|
| 1794 г. | Увядзенне «мяжы яўрэйскай аселасці» |
| 1839 г. | Полацкі царкоўны сабор |
| 1884 г. | Выпуск часопіса «Гоман» |
| 1905 г. | Прыняцце ўказа «Аб умацаванні пачаткаў верацярпімасці» |
| 1920-я гг. | Правядзенне палітыкі беларусізацыі |
| 1943 г. | Аднаўленне дзейнасці Маскоўскага Патрыярхату |
| 1989 г. | Заснаванне Беларускага Экзархата Рускай праваслаўнай царквы |
| 1992 г. | Прыняцце Закона Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» |
| 1992 г. | Устанаўленне дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Святым Прастолам і стварэнне Нунцыятуры Святога Прастола ў Рэспубліцы Беларусь |
| 1996–2021 гг. | Правядзенне рэспубліканскіх фестываляў нацыянальных культур |
| 2003 г. | Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай Праваслаўнай Царквой (БПЦ) |
| 2021 г. | Прызначэнне Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі першага беларуса па паходжанні (Веніяміна (Тупека)) |

*Вызначце ў табліцы падзеі, якія сведчаць аб фарміраванні і кансалідацыі беларускай нацыі.*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

§ 20-1

§ 20-2

§ 20-3

# § 20. Фарміраванне беларускай нацыі ў XIX — пачатку XX ст. і выспяванне беларускай нацыянальнай ідэі

**1.** Якія формы развіцця этнасу папярэднічаюць утварэнню нацыі?

**2.** У якіх палітычных і сацыяльна-эканамічных умовах адбывалася развіццё беларускага этнасу ў XIX – пачатку XX ст.?

**Умовы фарміравання беларускай нацыі. Асаблівасці яе станаўлення.** Працэс фарміравання беларускай нацыі як асаблівай этнічнай супольнасці адбываўся ў XIX — пачатку XX ст. у складаных гістарычных умовах. Стрымліваючымі фактарамі сталі адсутнасць уласнай дзяржавы, слабасць нацыянальнай буржуазіі і інтэлігенцыі.

Беларускія землі ў XIX — пачатку XX ст. уваходзілі ў склад Расійскай імперыі. Беларуская нацыянальная буржуазія знаходзілася на стадыі станаўлення і ўяўляла сабой найбольш слабую праслойку мясцовай шматнацыянальнай буржуазіі. Па агульнадзяржаўным перапісе 1897 г. буржуазія Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў на 84,7 % складалася з яўрэяў і толькі на 1,7 % з беларусаў.

Меў свае асаблівасці і працэс урбанізацыі. Сярод жыхароў беларускіх гарадоў больш за палову складала яўрэйскае насельніцтва. У некаторых гарадах яго доля даходзіла да 70 %.

*Узгадайце, у сувязі з якімі гістарычнымі падзеямі вышэйшыя навучальныя ўстановы на тэрыторыі Беларусі былі зачыненыя.*

Адсутнасць вышэйшых навучальных устаноў стала перашкодай для станаўлення нацыянальнай інтэлігенцыі. Своеасаблівай была і рэлігійная сітуацыя. Пасля ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі страцілі свой былы ўплыў каталіцызм і ўніяцтва. Большасць насельніцтва вызнавала праваслаўе.

**Фарміраванне агульных нацыянальных прыкмет.** Фарміраванню беларускай нацыі спрыялі агульнасць тэрыторыі, культуры, адзіная літаратурная мова, а таксама развіццё самасвядомасці і нацыянальнага характару.

Францішак Багушэвіч быў першым, хто назваў мову «адзежай душы». Паэтычна, але і з навуковай дакладнасцю ў прадмове да «Дудкі беларускай» ён вызначыў этнічныя межы Беларусі: «Можа, хто спытае: гдзе ж цяпер Беларусь? Там, братцы, яна, гдзе наша мова жывець: яна ад Вільна да Мазыра, ад Вітэбска за малым не да Чарнігава, гдзе Гродна, Міньск, Магілёў … і шмат мястэчкаў і вёсак…»



Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ




Межы рассялення беларусаў

*Выкарыстоўваючы картасхему, параўнайце пункты гледжання Я. Ф. Карскага і М. В. Доўнар-Запольскага на межы рассялення беларусаў. Зрабіце вывад.*

Развіццё капіталістычных адносін пасля адмены прыгоннага права, пераарыентацыя сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці на таварна-грашовыя адносіны, інтэнсіўнае развіццё чыгуначнага будаўніцтва прывялі да фарміравання адзінай эканамічнай прасторы і паскорылі працэс аб'яднання беларусаў.

Фарміраванне беларускай літаратурнай мовы было звязана з творчасцю В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча і іншых прадстаўнікоў беларускай нацыянальнай культуры. На фарміраванне нацыі станоўчы ўплыў аказала ўзнікненне і развіццё ў канцы XIX — пачатку XX ст. беларускага нацыянальнага руху.

*Абмяркуйце, якую ролю ў фарміраванні нацыі адыгрывае мова.*

Этнічная тэрыторыя беларусаў фарміравалася на працягу XIII–XVI стст. Пад уплывам прыродна-геаграфічнага асяроддзя склаліся пэўны тып гаспадарчай

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ



Францішак Багушэвіч
(1840–1900)

дзейнасці людзей, іх матэрыяльная і духоўная культура, мова, звычаі і традыцыі, нормы маралі, асаблівасці характару.

Пасля ўстанаўлення новага адміністрацыйнага дзялення ў пачатку XIX ст. этнічная тэрыторыя Беларусі знаходзілася ў межах расійскіх губерняў.

У XIX — пачатку XX ст. тэрыторыя Беларусі ўключала 35 паветаў пяці губерняў — Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай. Тут знаходзіліся 44 гарады. Іх колькасць на працягу XIX ст. практычна не змянялася.

**Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі.** Змены ў эканамічнай, сацыяльна-палітычнай і духоўнай сферах жыцця грамадства ў другой палове XIX ст. паўплывалі на працэс фарміравання беларускай нацыі. Крыніцай звестак аб нацыянальным складзе насельніцтва Беларусі ў XIX ст. з'яўляліся рэвізіі, якія праводзіліся для ўліку падатковага насельніцтва — мужчынскіх «душ».

Усяго на беларускіх землях у канцы XIX ст. пражывала 5710 тыс. беларусаў. Большасць насельніцтва жыла ў сельскай мясцовасці і адносілася да сялянскага саслоўя. У складзе гарадскога насельніцтва доля беларусаў складала 14,5 %.

Паводле перапісу 1897 г. беларусы ў Магілёўскай губерні складалі 82,4 %, Мінскай — 76 %, Віленскай — 56 %, Віцебскай — 52 % і Гродзенскай — 44 % ад усяго насельніцтва.

У беларускіх губернях налічвалася больш за 3100 тыс. рускіх, палякаў, украінцаў, яўрэяў, літоўцаў, латышоў, татараў. Польскае і літоўскае насельніцтва пражывала пераважна ў заходняй частцы Віленскай і Гродзенскай губерняў, рускае — у паўночных паветах Віцебскай губерні.

У 1794 г. беларускія землі па ўказе расійскай імператрыцы Кацярыны II былі ўключаны ў «мяжу яўрэйскай аселасці». Гэта прывяло да значнага павелічэння колькасці яўрэяў-іўдзеяў у гарадах і мястэчках краю. Яны склалі 13,8 % ад усяго насельніцтва Беларусі.

*Абмяркуйце, якія гістарычныя падзеі абумовілі шматнацыянальны склад насельніцтва Беларусі.*

На беларускіх землях пражывала каля 8 тыс. татараў, пераважна ў Мінскай губерні.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

**Характарыстыкі менталітэту беларусаў.** Унікальны і непаўторны менталітэт нашага народа фарміраваўся ў асаблівай геапалітычнай прасторы, на скрыжаванні Усходняй і Заходняй цывілізацый, што абумовіла ўплыў і ўзаемадзеянне розных культур, традыцый, рэлігій.

*Як вы разумееце, што такое «менталітэт»? Зверце сваё ўяўленне аб паняцці з фармулёўкай у гістарычным слоўніку.*

Беларусы на працягу ўсяго свайго гістарычнага шляху злучалі ў сваёй культуры, стаўленні да свету, характары розныя каштоўнасныя сістэмы, арыенціры, ідэалы. Мы заўсёды паважліва ставіліся да прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей і культур. У нас адсутнічае пачуццё перавагі над іншымі народамі. Беларусы цярплівыя, цягавітыя, неагрэсіўныя, міралюбныя, арыентаваны на мірнае суіснаванне з іншымі народамі. Але беларускі народ заўсёды гатовы са зброяй у руках абараняць сваю зямлю ад агрэсараў. Гэтаму нас навучыла гісторыя, напоўненая шматлікімі войнамі, якія развязваліся без нашага ўдзелу, але праходзілі на гэтай зямлі.

*Канкрэтызуйце прыкладамі з гісторыі праявы розных рыс менталітэту беларусаў.*

Этнограф і фалькларыст А. Шэйн (1826–1900) сцвярджаў, што ў побыце для беларусаў было характэрна роўнае становішча мужчыны і жанчыны. Нават у народных песнях, на яго думку, параўнальна мала згадак падначаленага становішча жонкі ў сям'і.

**Ідэалогія заходнерусізму.** **Заходнерусізм** пачаў фарміравацца ўжо з канца XVIII ст. пасля ўключэння беларускіх зямель у Расійскую імперыю і быў накіраваны на пераадоленне польскага ўплыву. Яго распаўсюджванне паскорылі паўстанні

М. Каяловіч сцвярджаў: «Рускі народ складаецца з трох плямёнаў: вялікарусаў, маларосаў і беларусаў. Гэта — факт рускага жыцця; ён даўно існуе і, безумоўна, будзе існаваць і далей, пакуль у Расіі будзе просты народ … усе мы, рускія інтэлігентныя людзі, навучаліся размаўляць і размаўляем адной і той жа літаратурнай рускай мовай … бессэнсоўна было б нам дзяліцца на племянныя групы. А тым больш праводзіць гэты падзел у народ».

*Спрагназуйце, які мог бы быць уплыў заходнерусізму на фарміраванне беларускай нацыі.*

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

1830—1831 і 1863—1864 гг. найбольш дакладнае афармленне заходнерусізм атрымаў у публікацыях М. Каяловіча. Ён, як і іншыя, прызнаваў асаблівасці беларусаў («беларускае племя»), але лічыў, што беларусы (заходнярусы), маларосы (украінцы) і вялікаросы (рускія) вельмі блізкія па паходжанні, мове і культуры, рэлігіі і складаюць галіны «трыадзінага народа рускага» як суперэтнасу. Заходнерусізм быў накіраваны на жорсткае і паслядоўнае абмежаванне польскага ўплыву на беларускіх землях.

| | |
|---|---|
| ЗАХОДНЕРУСІЗМ | • прызнанне беларускіх зямель расійскай тэрыторыяй;<br>• зацвярджэнне рускай нацыянальнай самасвядомасці ў сялянскім асяроддзі;<br>• узмацненне пазіцый Рускай праваслаўнай царквы. |

**Выспяванне беларускай нацыянальнай ідэі.** Абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці і фарміраванню беларускай нацыянальнай ідэі спрыялі публікацыі навуковых работ расійскіх навукоўцаў, якія працавалі на тэрыторыі Беларусі (Е. Раманаў, П. Шэйн, І. Насовіч, А. Сапуноў і інш.). Яны прысвечаны гісторыі, культуры, мове беларускага народа.

Значны ўклад у афармленне нацыянальнай ідэі ўнесла першая беларуская палітычная партыя — Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ). Яе стваральнікамі былі браты Іван і Антон Луцкевічы, А. Пашкевіч (Цётка), К. Кастравіцкі (Карусь Каганец) і інш. У сваёй дзейнасці партыя абапіралася на нацыянальную інтэлігенцыю.

Па ініцыятыве кіраўніцтва БСГ у 1906 г. была заснавана першая легальная газета на беларускай мове, якая друкавалася кірылічным і лацінскім шрыфтамі, — «Наша Доля». Пасля яе закрыцця ў Вільні стала выдавацца газета «Наша Ніва». Гэтыя выданні таксама адыгралі сваю ролю ў фарміраванні **нацыянальнай самасвядомасці** беларусаў.

У «Нашай Ніве» асноўная ўвага надавалася тэарэтычнаму абгрунтаванню права беларускага народа на захаванне і развіццё сваёй мовы і нацыянальнай культуры. Чытачам тлумачылася, што асіміляцыя і знішчэнне нацыянальных асаблівасцей



Фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці беларусаў спрыялі творы Я. Купалы


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

Верш «А хто там ідзе?».
Я. Купала


А хто там ідзе, а хто там ідзе
У агромністай такой грамадзе? —
Беларусы.
А што яны нясуць на худых плячах,
На руках у крыві, на нагах у лапцях?
Сваю крыўду.
А каму-ж нясуць гэту крыўду ўсю,
А куды-ж нясуць на паказ сваю? —
На свет цэлы.
А чаго-ж, чаго захацелась ім,
Пагарджаным век, ім глухім, сляпым?
Людзьмі звацца!

*Растлумачце, чаму верш напісаны ў выглядзе дыялогу. Чаму аўтар задае гэтыя пытанні?*

наносяць непапраўную шкоду не толькі беларускай, славянскай, але і сусветнай культуры.

Народны паэт Беларусі Янка Купала ў вершы «А хто там ідзе?» абвясціў аб існаванні беларусаў як самабытнага народа і тут жа заявіў аб іх праве на паважлівае стаўленне да сябе («Людзьмі звацца!») або, як сказана ім у іншым вершы «Маладая Беларусь», праве заняць «свой пачэсны пасад між народамі». Гэта выяўленая ў паэтычнай форме Дэкларацыя аб самаўсведамленні сябе беларусамі ў якасці асаблівага народа, роўнага ў сваіх правах з іншымі народамі.

Выбітны беларускі паэт М. Багдановіч у сваім публіцыстычным творы «Хто мы такія?» пісаў, што «рускіх народаў тры» і што «ўсе яны аднаго кораню». Аднак адзінства каранёў не дае падстаў лічыць беларусаў часткай рускага народа, а беларускую культуру — адгалінаваннем рускай. І тое і другое ўяўляюць сабой нацыянальна самабытныя з'явы.

**Тэарэтычнае афармленне беларускай нацыянальнай ідэі студэнтамі-гоманаўцамі.** На мяжы 1870—1880-х гг. у вышэйшых навучальных установах Пецярбурга і іншых гарадоў утварыліся гурткі студэнтаў-беларусаў рэвалюцыйна-дэмакратычнага кірунку. Адным з іх была група «Гоман». Яе кіраўнікі, выпускнікі віцебскай гімназіі А. Марчанка і Х. Ратнер, у 1884 г. выдалі два нумары аднайменнага часопіса.




Першы нумар нелегальнага часопіса «Гоман»

На яго старонках упершыню не толькі абвяшчалася, але і тэарэтычна абгрунтоўвалася існаванне самастойнага беларускага народа. Пры гэтым аўтары спасылаліся на прыродна-геаграфічныя, сацыяльна-эканамічныя і этнаграфічныя асаблівасці Беларусі, агульны гістарычны лёс і самабытную мову,

Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ

усведамленне беларусамі сваёй унутранай арганічнай сувязі, з аднаго боку, і адрозненні ад суседніх народаў — з іншага. «Усе гэтыя асаблівасці Беларусі — адзначалася ў выданнях — даюць ёй права на аўтаномную федэратыўную самастойнасць у сям'і іншых народнасцей Расіі». Шлях да рэалізацыі гэтага права аўтары бачылі ў сумеснай з расійскімі рэвалюцыянерамі барацьбе супраць агульнага ворага — царскага самадзяржаўя. Аўтары артыкулаў абвяргалі сцверджанне аб забітасці і інертнасці беларускага народа, які нібыта не мог разумець і адстойваць свае інтарэсы, у тым ліку неабходнасць стварэння ў будучыні нацыянальнай дзяржавы.

Такім чынам, перыяд XIX — пачатку XX ст. стаў часам станаўлення беларусаў як нацыі. На парадак палітычнага жыцця грамадства было пастаўлена пытанне аб самавызначэнні беларусаў як нацыі. У пачатку XX ст. гэтае пытанне актуалізавалася ў дзейнасці БСГ як першай беларускай палітычнай партыі і творчасці прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі.

1. Складзіце схему «Гістарычныя ўмовы фарміравання беларускай нацыі». Канкрэтызуйце гэтыя ўмовы гістарычнымі фактамі.
2. Якой была доля беларусаў у насельніцтве сельскай і гарадской мясцовасці? Уявіце, як дадзеная суаднесенасць магла паўплываць на працэс фарміравання беларускай нацыі.
3. Растлумачце, у чым палягае непаўторнасць менталітэту беларусаў. Якія яго рысы з'яўляюцца для вас вызначальнымі?
4. Як вы думаеце, чаму нацыянальная самасвядомасць большай часткі беларусаў у XIX — пачатку XX ст. заставалася на невысокім узроўні?
5. Сфармулюйце 3 тэзісы, адлюстраваўшы ў іх асноўныя ідэі групы «Гоман».

§ 21

# § 21. Эвалюцыя канфесійных адносін у XIX — пачатку XX ст.

1. Які ўплыў на фарміраванне этнасу аказвае рэлігія?
2. Што такое ўніяцкая царква? Калі яна з'явілася на беларускіх землях? З якімі гістарычнымі падзеямі гэта было звязана?

**Канфесійная палітыка расійскіх улад на тэрыторыі Беларусі.** Да канца XVIII ст. беларускае грамадства з'яўлялася поліканфесійным. Вялікая частка шляхты вызнавала каталіцтва. Большасць беларускіх сялян (каля 3/4) належала да ўніяцкай канфесіі. На тэрыторыі Беларусі таксама пражывалі праваслаўныя, іўдзеі, мусульмане, пратэстанты, стараверы.


Правообладатель Выдавецкі цэнтр БДУ